*Шосты этап гістарыяграфіі: даследаванне календару ў Рэспубліцы Беларусь.*

К канцу XX стагоддзя сфарміравана рэпрэзентатыўная факталагічная база праз ўсеабдымную як прафесійную, так і любіцельскую збіральніцкую працу, стварэнне фальклорных архіваў, выданне значнай колькасці зборнікаў запісаў, пашырэнне краязнаўчага руху. Тэарэтычнае асэнсаванне каляндарна-абрадавага комплексу гэтаксама мае значны даробак, а бібліяграфія пытання ўпэўнена перасягнула мінімум дзве сотні пазіцый.

Асаблівая ўвага да пытанняў каляндарнай абраднасці і вербальнага яе складніку ў першыя гады незалежнай Беларусі выявілася ў з'яўленні паказальнай колькасці асобных кніг па гэтай праблематыцы (гл. Бібляграфію).

Аднак к мяжы стагоддзяў нароўні з колькасным ростам даследаванняў назіраецца і імкненне да якасных зменаў. Даследчую планку задалі, з аднаго боку, працы прадстаўнікоў Маскоўскай этналінгвістычнай школы М.І. Талстога, з другога – падагульненні вядучых фальклАрыстаў Акадэміі навук Беларусі. Актыўна і творча распрацоўваюцца як "старыя" кірункі (апісанне фальклорных жанраў – калядныя, валачобныя, купальскія і інш. песні), так і маладаследаваныя тэмы, найперш пытанні сістэмнасці самога каляндарнага цыклу.

Навукоўцамі пачынаюць актыўна выкарыстоўвацца міждысцыплінарныя метады даследавання, актыўна скарыстоўваюцца набыткі замежных даследчыкаў; у навуковы пошук уключаюцца новыя, закрытыя раней тэмы.

Часам ставіцца пад сумніў прыняты ў савецкі час падзел даследаванняў на катэгарычна фалькларыстычныя і этнаграфічныя. Паступова вядучыя пазіцыі займае антрапалагічная трактоўка абрадавага тэксту, якая адсоўвае эстэтычны крытэрый на другі план і акцэнтуе комплексны характар фальклорнага факту, неадрыўна звязанага з комплексам уяўленняў і самімі дзеяннямі. Пашыраецца прапанаванае М. Талстым разуменне абраду як адзінства асноўных яго кодаў (вербальнага, акцыянальнага, лакатыўнага і г.д.).

Каляндарна-абрадавы комплекс перастае зводзіцца выключна да сялянскай культуры, усё больш увагі займае працэс адаптавання і трансфармацыі ў гарадскім асяродку. Да гэтага часу патрабуе пільнай увагі эвалюцыя абраднасці, яе ўзбагачэнне новымі элементамі, аналіз дзейнасці па свядомай рэвіталізацыі, рознага роду мадэрнізацыя.

Калі ж казаць пра беларускую фалькларыстыку апошніх дзесяцігоддзяў, то ў ёй усё больш выразна прасочваецца імкненне разглядаць усе тэкставыя комплексы не ў жанравых адносінах, а як складаную сістэму сімвалічных кодаў, інтэрпрэтацыя якіх цалкам лагічна прыводзіць да выяўлення і апісання істотных для культуры сэнсаў, незалежна ад таго, у якой форме і ў якой субстанцыі яны выяўлены: у слове ці дзеянні, ці замацаваны гэтыя сэнсы за

прадметам, за ўласцівасцю прадмета і да т.п. У агляданае дзесяцігоддзе з'явіўся шэраг работ, прысвечаных апісанню асобных кодаў: дэндралагічнага (Швед, 2000, 2004, 2006; Брэст), прадметнага і саматычнага (Валодзіна 1999, 2000, 2001–3, 2002, 2003, 2005–3), прасторавага (Лобач 2004; Полацк), арніталагічнага (Камарова 2004, 2005), астранамічнага (Санько 2004).